Вольга Зянонаўна Крэч

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Вольга Зянонаўна Крэч (25 красавіка 1969, в. Жупраны, Ашмянскі раён, Гродзенская вобласць) — беларускі ўрач, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7 склікання[1].

Вольга Зянонаўна Крэч	
Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь VII склікання	
Прэзідэнт	Аляксандр Лукашэнка
Нараджэнне	25 красавіка 1969 (54 гады) Жупраны, Жупранскі сельсавет, Ашмянскі раён, Гродзенская вобласць, БССР, СССР
Адукацыя	ГрДМУ
Дзейнасць	палітык
Вядомы як	===

Біяграфія

Нарадзілася 25 красавіка 1969 года ў в. Жупраны Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Педыятрыя»; клінічную ардынатуру Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Педыятрыя».

Працавала ўрачом-неанатолагам Полацкага радзільнага дома; участковым урачом-педыятрам Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы; загадчыкам дзіцячага аддзялення Акцябрскай цэнтральнай раённай бальніцы Гомельскай вобласці; урачом-педыятрам, урачом-неанатолагам (загадчыкам) педыятрычнага аддзялення для неданошаных дзяцей Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 3.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7 склікання, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве[2].

Сям’я

Замужам, мае дваіх дзяцей.

Узнагароды

- медаль «За працоўныя заслугі»,
- ганаровая грамата Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Зноскі

1. Сведения о результатах голосования по выборам депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь седьмого созыва 17 ноября 2019 года по Гомельской области (http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/itog_3.pdf)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20191124075141/http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/itog_3.pdf) 24 лістапада 2019.
2. Крэч Вольга Зянонаўна (http://house.gov.by/by/deputies-by/view/krech-volga-985/)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20200219111714/http://www.house.gov.by/by/deputies-by/view/krech-volga-985/) 19 лютага 2020.

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Вольга_Зянонаўна_Крэч&oldid=4188677"